Я цябе не забуду ніколі,
Буду доўга і моцна любіць,
Бо такую птушку Палесся
Не змагу я ніколі забыць.

*УДК 811.161.3*

# ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ ПРА ПРАЦУ Ў БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ

*А.Б. Яхімовіч – студэнтка 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Г.А.Смалянка*

Гістарычна велізарную частку жыцця нашых продкаў займае праца. Ды і для сучаснага чалавека праца незвычайна важная. Так што ёмістыя і вы разныя прыказкі аб працы не губляюць сваёй мудрай актуальнасці. У іх выказана глыбіня жыццёвага народнага вопыту і выказаны павучальныя назіранні, якія дэманструюць важнасць працы. Мноства прыказак ў ла канічна-гуллівай форме не толькі сцвярджаюць важнасць працы, але і за клікаюць паважаць працоўных, шанаваць чужыя намаганні.

Пры даследаванні рускіх і беларускіх прыказак пра крыніцы набыцця было выяўлена, што несумненнай каштоўнасцю для прадстаўнікоў гэтых этнасаў з'яўляецца ўласная працоўная дзейнасць: уласная праца выступае як аснова жыцця і залог дабрабыту. Тады як выкарыстанне вынікаў чужой працы атрымлівае відавочна негатыўную ацэнку.

Праца ў прыказкавых выразах, якія апісваюць крыніцы набыцця за кошт уласнай працы, знаходзіць адлюстраванне ў паняццях:

а) рамяство:

У ремесла не без промысла.

Ремесло пить-есть не просит, а хлеб приносит.

З рамяством дружыць – у жыцці не тужыць.

Рамясло піць-есці не просіць,а само корміць.

Варта заўважыць, што у большасці як рускіх, так і беларускіх народаў рамяство каваля ацэньваецца як тое, што прыносіць прыбытак:

Кузнецу, что козлу - везде огород.

У кавалей рукі ў золацу.

Каваль куе,кваліха пяе.

Таксама звяртаецца ўвага на фактары, якія аказваюць непасрэдны ўплыў на прафесійныя ўменні, навыкі людзей. Так, напрыклад, пазбавіцца свайго майстэрства чалавек можа пад уздзеяннем згубнай прыхільнасці да спіртнога, пра што сведчаць наступныя выразы:

Вино ремеслу не товарищ.
Было рамясло,ды хмелем парасло.
б) гаспадарчая дзейнасць чалавека:
Что помолотишь, то и в закром положишь.
Сам пашешь, сам сеешь, сам жнёшь – сам и ешь.
Хто таўчэ, той і хлеб пячэ.
Калі хочаш хлеб меці, то трэба зямліцы глядзеці.
Хто арэ ды сее, той збірае.
Дзе гаспадар ходзіць, там жыта родзіць.
Пільнуй гаспадаркі- будуць у гаршку скваркі.
У добрага гаспадара ўсё ёсць.
У добрай гаспадыні і певень нясецца.

У цэлым аналіз канструкцый пра крыніцы набыцця, звязаны з уласнай працай, дазваляе адзначыць, што такая працоўная дзейнасць – несумненная каштоўнасць для прадстаўнікоў двух этнасаў. Уласная праца з'яўляецца асновай жыцця і закладам дабрабыту,роўна як і праца наогул.

Без труда не вынешь и рыбку из пруда.
Хочешь есть калачи, так не сиди на печи.
Праца і корміць і поіць.
Без працы з неба кашка не будзе сыпацца.

Праца таксама вызначаецца як "чорная", гэта значыць брудная, аднак вынік - "грошыкі белыя", "белы хлеб":

Хоть работа черна, да денежка бела.
Праца чорная - белы хлеб.

У выразах таксама фіксуецца меркаванне, згодна з якім не заўсёды той, хто працуе можа скарыстацца вынікамі сваёй працоўнай дзейнасці:

І так бывае: хто працуе, той не мае.
Хто пацее, а хто сыцее.
А наступныя прыказкі канкрэтызуюць:
Мужик не живёт богат, а живёт горбат.
Мужык многа працуе, ды нічога не мае.

Такім чынам у беларускіх прыказках і прымаўках адным з асноўных з'яўляецца паказ значэння працы ў сялянскім жыцці, дзе ўвасоблены шматвяковы вопыт народа, ягоназіранні за з'явамі прыроды і звязаныя з імі разважанні і павучанні. У адрозненне ад прымавак пра працу ў рускай мове беларуская мова насычана прыказкамі пра працу толькі як станоўчую з'яву. Большасць беларускіх прыказак носіць павучальны характар. Яны скіраваны супраць гультайства і ляноты ў паўсядзённым жыцці, бо праца – гэта аснова жыцця,без яе жыццё не ўяўляецца.